ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 58 (1327) | ЧАЦЬВЕР, 12-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Нямецкі друк аб дакладзе тав. Молатава

БЭРЛІН, 10. Нямецкі друк публікуе падрабязныя вытрымкі з прамовы старшыні СНК СССР т. Молатава. Орган партыі цэнтра „Нямеччына“ піша: Молатаў у сваіх заявах, прысьвечаных пытаньням замежнай палітыкі, выказаў задавальненьне па прычыне палапшэньня савецка-нямецкіх адносін пасьля таго, як упала хваля варожага СССР крыжовага паходу ў Нямеччыне. Нам здаецца, што старшыня Савету Народных Камісараў памыляецца ў ацэнцы настрояў, пануючых у шырачэзных колах у адносінах да культурнай палітыкі комунізму“.

Газэта выражае сваю незадаволенасьць у тым, што комунізм вядзе сваю „падрыўную“ работу ў Эўропе і пускаецца ў разважаньні аб неабходнасьці спыненьня Комінтэрнам сваёй дзейнасьці,

Жыцьцём прыстаўленая да ганебнага слупа

14 гадоў, якія аддзяляюць нас д дня нізрынуцьця царскага самаладзтва, зусім нязначны тэрмін. днак, за гэты, параўнаўча мінімальны, час краіна саветаў карэнным чынам зьмяніла свой эканомічны. соцыяльны і культурны вар.

„Расія“ царская, якой „кіраваў“ гагодзьзямі „памазаньнік божы“ з эўраю ненасытных вампіраў была аведзена да голечы, жабрацтва, азбурэньня.

Падрыхтаваная непасрэдна гістарычным ходам разьвіцьця Расіі лютаўская рэволюцыя, нізрынуўшая царскае самаўладзтва, была паскорана зацяжкай імпэрыялістычнай вайны, разбурэньнем вытворчых сіл, абрабаваньнем жывой і матар'яльнай сілы вёскі, згуртаваньнем у казармах валікіх рабочых і сялянскіх мас.

Трэба адзначыць здрадніцкую ролю соцыял-дэмократаў меншавікоў, якія адкрыта перайшлі ў лягер буржуазіі ў пачатку імпэрыялістычнай бойкі і пачалі агітаваць працоўных ісьці на вайну, губляць жыцьцё, амываць крывёю палі, „за бацькаўшчыну, за цара-бацюшку“— замест бальшавіцкага лёзунгу „вайна-вайне“. І ў час самой лютаўскай рэволюцыі, калі быў зроблены пераварот рабочымі і салдацкімі масамі, пры падтрыманьні сялян, пры яўных супярэчнасьцях з боку буржуазіі, меншавікі настаялі перадаць уладу буржуазнаму ўраду, бо, па іхнаму, у рэволюцыі была гегемонам і павінна застацца буржуазія, а не пролетарыят.

Урад Львовых, Гучковых, Керанскіх, Мілюковых, пры актыўнай падтрымцы Данаў, Абрамовічаў, па сваёй клясавай прыродзе ня змог і не жадаў спыніць імпэрыялістычную бойку; па прыкладу царскага ўраду ён менш усяго клапаціўся аб палепшаньні становішча працоўных.

На высунутыя патрабаваньні рабочых: пад кіраўніцтвам бальшавікоў нацыяналізаваць заводы і фабрыкі, аддаць у карыстаньне сялянам бяз выкупу абшарніцкія і манастырскія землі, ператварыць гэта ў сродкі набытку працоўных, прадставіць свабоду прыгнечаным нацыянальнасьцям і г. д. часовы ўрад, на чале з меншавікамі і эсэрамі, Керанскімі, Чарновымі, Мілюковымі, працягваючы (у больш завуаляваных, удасканаленых формах) палітыку буржуазіі, адкладваў вырашэньне гэтых першачарговых пытаньняў да ўчрадзілкі. Яны імкнуліся спачатку закончыць імпэрыялістычную вайну. а потым, на так званых „дэмократычных“ пачатках, учыніць расправу над „бунтарамі“ рабочымі і сялянамі.

З такімі фактычна плянамі гэта нанятая зграя цапных сабак—меншавікоў, эсэраў, выконваючы соцыяльны заказ буржуазіі, атакавала, на працягу ўсяго існаваньня, краіну дыктатуры пролетарыяту. Аднак, не ўдалося ім ні ў дні грамадзянскае бойкі разам з сусьветным імпэрыялізмам, ні ў час блёкады загубіць пролетарскую дзяржаву. Іхныя пляны і надзеі на капіталістычную рэстаўрацыю ў СССР не спраўдзіліся, біта апошняя стаўка на інтэрвэнцыю ў СССР з мэтай нізрынуць дыктатуру пролетарыяту. Нікчэмная і ганебная роля меншавікоў зараз выкрыта перад усім сьветам пролетарскім судом па справе 14 шкоднікаў-меншавікоў, так званага „саюзнага бюро“ соцыял-дэмократаў у Маскве. Яны, як здраднікі справе пролетарыяту, самым жыцьцём прыстаўлены да ганебнага слупа.

Краіна саветаў, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, з кожным днём расьце і мацнее. Нябачанымі тэмпамі разьвіваецца прамысловасьць і сельская гаспадарка. У прыватнасьці Беларусь з краіны прыгнечанай, адсталай, з краіны аграрнай, спажывецка-таварнай ператвараецца ў краіну індустрыяльна-аграрную, таварна-спажывецкую, у краіну растучай, квітнеючай культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу. У выніку гэтых соцыяльных і эканомічных зрухаў, мы маем вялікія зьмены і ў клясавых суадносінах. На глебе правядзеньня суцэльнай колектывізацыі ліквідуюцца апошні аплот капіталізму—кулацтва, як кляса Ліквідацыя гэтае клясы праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, якая мае свой адбітак ня толькі ўнутры нашай краіны, але і за межамі яе. Аб гэтым сьведчыць ускрыцьцё раду контррэволюцыйных шкодніцкіх організацый, сьведчыць шалёная антысавецкая кампанія, узьнятая буржуазіяй: „крыжовы паход папы рымскага“ „савецкі дэмпінг“, “прымусовая праца“.

Зьмена клясавых суадносін у карысьць пролетарыяту ўнутры краіны саветаў шчыльна зьвязана з абвостраньнем нашых замежных узаемаадносін, бо шпаркі рост нашага соцыялістычнага будаўніцтва вядзе да абвостраньня вялізарных супярэчнасьцяй, якія захаваны ў самім факце існаваньня на зямной кулі дзьвёх сыстэм: соцыялістычнай і капіталістычнай. Соцыялістычнай, якой належыць будучае. якая з кожным днём расьце і капіталістычнай,--якая разьдзіраецца унутранымі супярэчнасьцямі. задыхаецца ў кіпцюрох эканомічнага крызісу.

Працоўныя ўсяго сьвету, успамінаючы аб лютаўскай рэволюцыі, як аб прадвесьніку Кастрычнікаўскай. пролетарскай рэволюцыі, прадвесьніку вялікай хвалі сусьветных клясавых боек пролетарыяту,—сеньня, праз 14 гадоў з часу нізрынуцьця царскага самаладзтва, яшчэ больш згуртоўваюцца вакол комуністычнае партыі—надзейнага, выпрабаванага кіраўніка і організатара клясавых боек для апошніх і рашаючых сутычак з капіталізмам.

Рабочыя, колгасьнікі, бядняцка-серадняцкія масы краіны саветаў, успамінаючы пра мінулае, пра „Расею царскую“, яшчэ больш мобілізуюць пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, свае сілы на завяршэньне пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі, на пасьпяховае выкананьне пляну вялікіх соцыялістычных работ—пяцігодкі ў 4 гады, замятаючы назаўсёды сьляды да старога.

Пад сьвятлом неабвяржымых фактаў

Сводкі прыкладаў выкрываюць устаноўкі II інтэрнацыяналу на інтэрвэнцыю супроць СССР

Соцыял-дэмократы--соцыял-фашыстыя

БЭРЛІН, 9.—Орган комуністычнай партыі Швэйцарыі „Базэлер Форвэртс“ прыводзіць зводку заяў лідэраў соцыял-дэмократычнай партыі Швэйцарыі і лідэраў II інтэрнацыяналу, якія яскрава адлюстроўваюць інтэрвэнцыяністцкую ўстаноўку II інтэрнацыяналу ў адносінах да Савецкага саюзу. Так, напрыклад, сэкратар II інтэрнацыяналу, Фыдрых Адлер пісаў у Цюрыкскім органе швэйцарскіх соцыял-дэмократаў „Фольксрэхт“ ад 6 лютага 1929 г.

„Міжнародная рабочая кляса была-б цяпер ужо значна далей на сваім гістарычным шляху, калі-б бальшавікі ў Расіі не захапілі ўладу“. Той-жа Фыдрых Адлер пісаў год назад: „II інтэрнацыянал можа прыняць актыўны ўдзел у вайне, калі яе нядвухсэнснай мэтаю ня будуць інтарэсы дэмократыі і соцыялізму“. Як вядома, меншавікі і іншыя партыі II інтэрнацыяналу заўсёды заяўляюць, што ў іх барацьбе супроць Савецкага саюзу справа ідзе аб „аднаўленьні дэмократыі“ ў Расіі“, Такім чынам, заява Адлера азначае, што ў вайне супроць Савецкага саюзу, праводзімай пад лёзунгам: „аднаўленьне дэмократыі“, II інтэрнацыянал прыме „актыўны ўдзел“.

Старшыня соцыял-дэмократычнай партыі Швэйцарыі, Эрнст Рэйнгардт, напісаў у соцыял-дэмократычнай газэце „Базэлер арбэйтэр цэйтунг“ ад 27 лютага 1930 г. артыкул з поваду крыжовага паходу рымскага папы супроць Савецкага саюзу, у якім Рэйнгардт абвінавачваў Савецкі саюз „у падбухторваньні к вайне“. Рэйнгардт заявіў у гэтым артыкуле, што на выпадак вайны супроць Савецкага саюзу соцыял-дэмократычныя партыі ня будуць зьяўляцца проста прыхільнікамі і бязвольнымі памочнікамі адной ці другой ваюючай краіны“.

Комуністычны „Базэлер Форвэртс“ указвае на тое, што ў выпадку вайны ня можа быць і гутаркі аб якім небудзь нэйтралітэце, а таму практычны сэнс заявы Рэйнгардта азначае, што соцыял-дэмократы, на вы пада вайны супроць Савецкага саюзу, стануць на бок імпэрыялістых.

Паліцыя разганяе дэмонстрацыю беспрацоўных (ПАЗШ)

Пролетарыят будзе працягваць процэс над меншавізмам

ПАРЫЖ, 9. Комуністычная „Юманітэ“ публікуе ліст свайго корэспондэнта аб процэсе „Саюзнага бюро“ меншавікоў, напісаны напярэдадні агалашэньня прысуду. Газэта піша, што „бяручы пад сваю абарону меншавікоў, правадыры II Інтэрнацыяналу абараняюць больш чым „інтарэсы“ шкодніцтва і інтэрвэнцыі, — яны тым самым абараняюць самых сябе“.

Яны адчуваюць,—адзначае газэта,—што калі рабочыя, ашуканыя іх дэмагогічнымі пацыфісцкімі манэўрамі, яшчэ ідуць за імі, дык пасьля таго, як убачаць іх сапраўдную ролю, ускрытую на процэсе, уплыву II Інтэрнацыяналу ў асяродзьдзі рабочых будзе пакладзен канец. Немагчыма, каб рабочыя, якія яшчэ давяраюць Блюмам і Жуо прайшлі міма выкрыцьцяў, зробленых на процэсе. Немагчыма, каб рабочыя здавальняліся двурушніцкімі тлумачэньнямі, якімі іх ушаноўвае які-небудзь Розэнфельд, і не накінуліся-б на сваіх кіраўнікоў, патрабаваўшы ад іх справаздачы ў іх чыннасьці. Рабочыя, якія ідуць яшчэ за соцыялістычнай партыяй, за рэформістамі, зусім не зьяўляюцца прыхільнікамі гаспадарчага шкодніцтва ці інтэрвэнцыі ў адносінах да СССР. Разам з усім пролетарыятам Францыі, з усім сусьветным пролетарыятам яны горача, усімі сіламі стаяць за СССР і змагаюцца супроць інтэрвэнцыі.

Процэс міжнароднага меншавізму, яраснага ворага пролетарскай рэволюцыі ў Расіі, а значыць і ворага пролетарыяту ўсіх краін, пачаўся ў Маскве, але ён будзе працягвацца,—піша газэта,—на прадпрыемствах ва Францыі, Нямеччыне, Англіі і ва ўсіх іншых капіталістычных краінах.

Кампанія цьвердалобых супроць СССР

ЛЁНДАН, 9, Антысавецкая кампанія друку прыняла адкрыты характар простых атак на пяцігодку і настойлівага заклiку да экономічнай блёкады СССР. Артыкулы аб небясьпеках, якімі пяцігодка пагражае капіталістычнаму сьвету, зьяўляюцца ў газэтах, амаль штодзенна. У выступленьнях консэрватыўных лідэраў, а таксама прадстаўнікоў прамысловых, гандлёвых і фінансавых колаў сыстэматычна падкрэсьліваецца пагроза, якую нясе буржуазным краінам экономічны росквіт СССР і пэрспэктывы ажыцьцяўленьні пяцігодкі.

Сёньня вялікія артыкулы аб пяцігодцы надрукаваны адначасова ў чатырох газэтах, у тым ліку ў „Дэйлі Тэлеграф“ і „Дэйлі Мейль“. „Манчэстэр Гардыян“ заяўляе, што цьвердалобыя спужаліся размаху экономічнага будаўніцтва СССР. Іх атакі супроць пяцігодкі роўнамоцны прызнаньню сілы і продукцыйнасьці савецкай сыстэмы, „раз яна здольна на працягу пяці год ператварыць краіну, экономічна самую адсталую сярод эўропэйскіх дзяржаў, ў магутную сілу, якая зможа адней нескладанай маніпуляцыяй у галіне экспорту разбурыць другія краіны і іх цывілізацыі“.

У свой час эўропэйскія дзяржавы многаму навучылі Савецкі Саюз. Цяпер „пяцігодка“ азначае імкненьне СССР паставіць сябе ў такое становішча, пры якім яна магла-б бяз цяжкасьцяй перанесьці блёкаду.

„Дэйлі Тэлеграф“ заклікае да эконамічных рэпрэсій супроць СССР

ЛЁНДАН, 10. Прамова тав. Молатава ў частцы, што датычыцца замежнай палітыкі савецкага ўраду, апублікована амаль ва ўсіх ангельскім газэтах. Консэрватыўная прэса публікуе паведамленьні з прамовы тав. Молатава, насычваючы іх варожымі комэнтарыямі.

Большасьць газэт старанна замоўчвае заяву Молатава ў адказ на паклёпніцкую кампанію ангельскіх цьвёрдалобых у пытаньні аб „рабскай“ працы ў СССР.

Консэрватыўная „Морнінг Пост“, прыводзячы словы тав. Молатава аб магчымасьці існаваньня капіталістычнай і соцыялістычнай сыстэм на працягу пэўнага пэрыоду часу і неабходнасьці для абедзьвюх сыстэм зрабіць вывады з гэтага, газэта робіць звычайнае для яе заключэньне, што „СССР зьбіраецца весьці змаганьне ў сусьветным маштабе“.

„Дэйлі Тэлеграф“ прымушана прызнаць наяўнасьць значных экономічных дасягненьняў СССР. Газэта прызнае бездапаможнасьць капіталістычнага сьвету ў яго спробе перамагчы экономічны крызіс.

Асноўваючыся на гэтых разважаньнях, газэта заклікае лейбарысцкі ўрад пасьледваць прыкладу Францыі, Бельгіі, Румыніі, Югаславіі, Амэрыкі, Канады—стаць на шлях экономічных рэпрэсій супроць СССР.

ПА ШЛЯХУ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ПЛЯНА БАЛЬШАВІЦКАГА ПАХОДУ

Бабруйская комсамолія ўдарна рэалізуе маршруты баявых дзеяньняў

На далей не паслабляць барацьбу за хутчэйшае выкананьне плянаў па кантрактацыі і падрыхтоўкі да сяўбы

За рамонтам трактару

Менскі прыгарадны с-с не закантрактаваў ніводнага га

Менскі прыгарадны сельсавет яшчэ не распачаў работу па кантрактацыі. Адозва ЦК УсеКП(б) і ўраду аб кантрактацыі не даведзена да шырокіх мас вёскі.

Згодна плянаў па сельсавеце неабходна закантрактаваць 333,55 га яравых культур, з якіх—135,35 агародаў. Але ніводнага гектара не закантрактавана. Сельсавет нават ня ведае аб тым, наколькі процантаў неабходна пашырыць пасеўплошчу. Па гэтаму пытаньню ніякай растлумачальнай працы не праводзіцца.

Г. Ф.

БАБРУЙСКАЯ КОМСАМОЛІЯ РАЗГОРТВАЕЦЦА Ў ПАХОДЗЕ

Бабруйская комсамольская арганізацыя прыступіла да рэалізацыі намечаных плянаў баявых дзеяньняў па правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі."

1-га сакавіка райком комсамолу склікаў шырокую нараду актыву комсамольцаў гораду сумесна з шэфпрацаўнікамі ячэек на вёсцы. Нарада абгаварыла плян баявых дзеяньняў комсамольскага буксіру і ўдзел грамадзкіх арганізацый ў правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Пасьля нарады ячэйкі вылучылі 22 буксірныя брыгады, якія разьехаліся па сельсаветах, колгасах, вёсках на дапамогу комсамольскім ячэйкам у рэалізацыі плянаў баявых дзеяньняў.

Акрамя гэтых буксірных брыгад ячэйкі ЛКСМБ Сампрамсаюзу, заводу Варашылава, ФЗВ мэталістых пры заводзе імя Сталіна, накіравалі ў падшэфныя колгасы, комсамольскія брыгады 25 асоб па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара.

8-га сакавіка праведзена нарада сэкратароў колгасных і вясковых ячэек сумесна з буксірнымі брыгадамі, дзе агавораны пытаньні рэалізацыі пляну баявых дзеяньняў, падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі і разгортваньня тэмпаў колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Вось некаторыя прыклады дзейнасьці комсамольскіх буксірных брыгад. Ячэйка вёскі **Цялушы**, якая да апошняга часу нічога не рабіла ў справе падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі, зараз узята на буксір. Гэта ўзварушыла ўсю масу комсамольцаў і мобілізавала іх на падрыхтоўку к вясеньняй сяўбе.

Ячэйка колгасу **„Пчолка“** арганізавала ўдарныя брыгады па ачыстцы і сартыроўцы насеньня. Колгас ўзяў на буксір адстаючыя колгасы тэрыторыі Варатынскага сельсавету. Зараз колгас „Пчолка“ мае прыліў на 10 гаспадарак; ячэйка вырасла за апошні час на 15 чалавек.

На гуце „Комінтэрн“ быў склікан мітынг рабочых сумесна з працоўным сялянствам акаляючых вёсак па пытаньню падрыхтоўкі да сяўбы пасьля чаго ў колгас вёскі Глуша ўліліся 15 новых аднаасобных гаспадарак. Колектыў комсамолу гуты ўзяў шэфства над акаляючымі колгасамі.

Пацева-Слабодзкая яч. ЛКСМБ аказала вялікую дапамогу ў справе арганізацыі Пацева-Слабодзкага колгасу, у які ўвайшло 26 гаспадарак. Колгас праводзіць зараз абагуленьне насеньня, цягавай сілы і шпарка рыхтуецца да вясеньняй сяўбы. У колгас, за выключэньнем 2 комсамольцаў, увайшла ўся ячэйка. Гэтая-ж самая ячэйка сабрала 500 пудоў попелу.

Буксірная брыгада, якая выехала ў колгас „Сьвет“, рыхтуе сумесна з ячэйкай зьлёт батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі сельсавету па пытаньню падрыхтоўкі к 2-й бальшавіцкай вясьне і колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У Любаньскім сельсавеце буксірная брыгада правяла сход комсамольскай ячэйкі сумесна з беспартыйнай моладзьдзю (удзельнічала 75 чал.), сход распрацаваў і ўхваліў плян баявых дзеяньняў раённага „комсамольскага буксіру“.

Неабходна адзначыць, што ёсьць ячэйкі, якія зусім бязьдзейнічаюць, як напрыклад: Хімаўская, колгасаў „Найлебэн“, „Прогрэс“ і рад іншых.

У колгас „Найлебэн“ мелі месца выступленьні паасабных комсамольцаў на сходзе колгасьнікаў супроць тарафікацыі аплаты працы ў колгасе, былі імкненьні пакінуць колгас— апошнім далі руйнуючы адпор.

Патрэбна таксама адзначыць, што некаторыя вясковыя ячэйкі па-дзяляцку падыходзяць да прыцягненьня піонэрарганізацыі да ўдзелу ў перабудове сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад і падрыхтоўкі к веснавой сяўбе. Піонэрарганізацыі толькі зьбіраюць попел (яч. Цялушы, Брожы і інш.)

Ф. Хазанаў

Комсамол Чэрвеньшчыны ўключыўся ў плян баявых дзеяньняў

Чэрвеньскі райком ЛКСМБ мобілізаваў усю раённую комсамольскую арганізацыю на правядзеньне другой бальшавіцкай вясны

На гэты час раённая комсамольская арганізацыя абвясьціла сябе мобілізаванай і ператвараецца ва ўдарны полк, які падзяляецца на роты, узводы і брыгады. Перад ударным палком ставяцца наступныя задачы;

1, Дапамога партыі ў ажыцьцяўленьні пастановы аб колектывізацыі раёну да вясны да 35 проц. і ахопе першапачатковымі таварыствамі астатніх 65 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

2. 100 проц. выкананьне плянаў кантрактацыі яравых пасеваў.

3. Організацыя працы ў новых колгасах, забясьпечаньне поўнага выкананьня пляну другой бальшавіцкай вясны

4 Сабраць у касы ашчаднасьці 2500 руб. і распаўсюдзіць пазыку „пяцігодка—у чатыры гады“ на суму 10 тысяч руб.

5. Забясьпечыць сьвінаводчыя саўгасы і колгасы сьвінаматкамі кармамі і кадрамі

6. Наладзіць сыстэматычную культурна-масавую працу ў колгасах і сярод бядняцка-серадняцкіх аднаасобнікаў, узьмацніць культэстафэты, распаўсюдзіць 2000 экз. газэты „Чырвоная Зьмена“ і 500 экз. раённай газэты „Колектывіст“.

7. Наладзіць сыстэматычную вайсковую вучобу: усе чырвонаармейцы ўдарнага палка вывучаюць програму першай ступені для вайскова-паходных гурткоў,

8. Глыбока прапрацаваць пастановы X зьезду ЛКСМБ, IX зьезду УсеЛКСМ, кантрольныя лічбы пяцігодкі на трэці рашаючы прамовы Леніна на 3 зьезьдзе КСМ, прамовы Сталіна на конфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці.

Міхась Ракіта.



За пратраўкай насеньня

Белколгасцэнтр і трактарацэнтр зрываюць рамонт трактараў

Магілеў (пошта-тэлеграма). Па дагавору з Белколгасцэнтрам магілеўскі завод „Адраджэньне“ да 15 сакавіка 1931 году павінен выпусьціць з рамонту 60 трактароў. На 4-III на завод паступіла для рамонту толькі 29 трактароў, з якіх адрамантавана 13.

Трактара-цэнтр, які абавязаны забясьпечыць своечасовую дастаўку трактароў на завод і дастаўку запасных частак для замены зношаных, да гэтага часу нічога не зрабіў, што зрывае рамонт трактароў. З ліку адрамантаваных трактароў палова ня можа быць скарыстана для працы ў полі, таму, што патрабуецца замена зношаных частак.

Мы лічым такія адносіны недапушчальнымі і патрабуем зараз-жа забясьпечыць завод хворымі трактарамі і запаснымі часткамі для рамонту апошніх.

Сэкратар Магілеўскага РК ЛКСМБ Снапкоў

Сэкратар комсамольскага колектыву Двоскін

Пытаньні організацыі працы ў колгасах у вясеньнюю пасеўкампанію

Далейшае пасьпяховае выкананьне пляну колектывізацыі сельскае гаспадаркі БССР (давядзеньне яе да 45 пр. у 31 г.) з усёй астрынёю высоўвае асноўную задачу: замацаваньне існуючых колгасаў шляхам правільных соц. мэтодаў організацыі колектыўнае працы.

У гэтым кірунку колгасы яшчэ дагэтуль ня маюць належнага пералому. Рад фактаў нядбальства, безгаспадарнасьці, недысцыплінаванасьці, разгільдзяйства, нерацыянальнага скарыстаньня магчымасьцяй колектыўнае вытворчасьці сьведчыць аб гэтым. Вельмі частка ў паасобных колгасах траціцца шмат часу на збор рабочае сілы пры нарадах (часамі даходзіць да 1 гадзіны), на непатрэбную перакідку кольгасьнікаў з аднае працы на другую, на пошукі неабходных прадметаў для вытворчасьці (былі выпадкі, калі на адшуканьне павадка да бараны траціласа па 2 гадзіны).

У 2-ую бальшавіцкую вясну мы павінны пакласьці канец падобным зьявам і зрабіць рашучы паварот у бок павышэньня вытворчасьці працы на грунце ўвядзеньня такіх форм організацыі працы і разьмеркаваньня вынікаў гаспадарчага году, які-б узьнімалі ў колгасьнікаў інтарэс да павышэньня колькасных і якасных паказчыкаў сваёй работы.

Аднэй з такіх форм організацыі колектыўнае працы зьяўляецца зьдзельшчына, пры якой ацэньваецца работа не па колькасьці прапрацаванага часу, а па якасьці і колькасьці праробленай работы. На вопыце раду колгасаў зьдзельшчына апраўдала сябе, як лепшы мэтод для павышэньня вытворчасьці колектыўнае працы, узмацненьня гаспадаркі і пасьпяховай барацьбы з дробна-буржуазнымі і кулацкімі настроямі ўнутры колгасаў.

У колгасе Энгельса на ўборку 1-га бульбы траціласа 24 чалавекадні, пры ўвядзеньні-ж норм выпрацоўкі і зьдзельных работ затраты зьнізіліся да 14 чалавекадзён. На ўборку 175-га бульбы траціласа 4200 чалавекадзён, пры зьдзельшчыне—2450, прычым павялічылася і выпрацаваная продукцыя Падобныя прыклады можна прывесьці з вопыту цэлага раду колгасаў.

Увядзеньне зьдзельных работ у колгасах у сваю чаргу патрабуе дасканалага ўстанаўленьня норм выпрацоўкі па кожнай паасобку галіне работы напрыклад: адзін чалавек пры адным кані за 10 гадзінны рабочы дзень можа ўзараць адналямешным плугам на глыбіню 12 сантымэтраў 0,5 га сярэдняй глебы, альбо адна даільніца у вясновы час павінна выдаіць, пры 12 каровах, 70 літраў малака ў дзень.

За гэтыя работы, пры ўмове выпрацоўкі норм колгасам, работніку залічваецца 1½ працадня. Побач з устанаўленьнем норм выпрацоўкі па кожнай рабоце, дзе ўлічваецца ня толькі колькасьць работы, але і абавязковая яе якасьць, колгас робіць ацэнку кожнага яе выгляду ў прац. адзінках (працдзень) прыкладна так: 1) за ворку адналямешным плугам на аднаго каня за 10 гадзінны рабочы дзень, пры норме выпрацоўкі 0,5 га, залічваецца 1,5 працадня; 2) за ворку трактарам „Чырвоны Пуцілавец“ у адну зьмену, пры норме выпрацоўкі 2-га, залічваецца 2-працадні; 3) за баранаваньне ў 2 сьляды трохзьвеннай бараною зыгзаг, пры 2-х конях з дзённай вытворчасьцю (10 гадзін) 2-га, залічваецца 0,68 працадня і г. д.

Устанаўленьне нормы выпрацоўкі колгасаў і працоўныя расцэнкі работ даводзяцца да кожнага паасобнага колгасьніка з тэй мэтай, каб ён, прыступаючы да працы, ведаў аб разьмеры дзённай выпрацоўкі і аб колькасьці працадзём, якія яму налічваюцца.

Зьдзельныя работы можна ўжываць ва ўсіх галінах колгаснай вытворчасьці, за выключэньнем паасобных работ, якія цяжка паддаюцца, альбо зусім не паддаюцца нормаваньню, як напрыкляд, вартаўнік саду, жывёлы, бухгальтар, старшыня праўленьня, у тым выпадку калі ён вызвалены ад вытворчай працы, і інш.

Зьдзельшчына можа быць трох наступных асноўных форм: 1) брыгадная, 2) групавая, 3) індывідуальная

Брыгаднай называецца такая зьдзельшчына, калі тая ці іншая праца выконваецца зьдзельна ўсёй брыгадай (брыгада аратых, трактарыстых); брыгадная зьдзельшчына добрая і выгадная пры спэцыялізаваных брыгадах, дзе усе члены выконваюць адначасовую работу. На даны час. пры ўмове ўтварэньня комбінаваных брыгад, належыць раіць, як найбольш зручную форму зьдзельных работ, групавую зьдзельшчыну (група аратых, баранавальнікаў, падяводаў і г. д.), але ні ў якім выпадку нельга ігнараваць індывідуальную зьдзельшчыну.

Пераход на зьдзельную работу ў колгасах дае шырокія магчымасьці скарыстаць новыя соц. мэтоды вытворчасьці: соц. спаборніцтва, ударніцтва, сустрэчны прамфінплян і г. д.

Усё гэта павінна стымулявацца ў выглядзе прэміі за лепшую работу, за перавыкананьне норм выпрацоўкі контрольных лічбаў за лепшую якасьць і інш. паказчыкі, накіраваныя да вытворчасьці колектыўнае працы.

У другую бальшавіцкую вясну ніводзін колгас не павінен застацца пры старых формах організацыі працы (паядоцкая, падзённая, грашовая), якія, у тым ці іншым выглядзе, льлюць ваду на млын клясавага ворага. Ніводнага колгасу бяз зьдзельных работ—вось лёзунг колгасаў, які нанясе рашучы ўдар па ворагу, па кулацкім уплыве ўнутры колгасу, па ўтрыманскіх настроях. За зьдзельшчыну, за соц. формы і мэтоды організацыі колгаснае працы.

Разам са зьдзельшчынай вялікай увагі заслугоўваюць брыгадныя сыстэмы організацыі працы, як адзін з лепшых спосабаў павышэньня вытворчасьці працы, падвышэньня грамадзкай прац. дысцыпліны, грамадзкай адказнасьці, узаемадапамогі, самаконтролю, што садзейнічае канчатковаму зьнішчэньню дробна-уласьніцкай псыхолёгіі колгасьнікаў.

Асноўнымі формамі брыгад ва ўдарную вясновую пасеўную кампанію павінны быць комбінаваныя і спэцыялізаваныя, з перавагай першых.

У спэцыялізаванай брыгадзе ўсе яе ўдзельнікі выконваюць адну спэцыяльную работу, напрыклад: трактарыстыя, даільніцы, касцы. Комбінаваныя-ж брыгады выконваюць адразу некалькі пасьлядоўных відаў работ напрыклад, брыгада паляводзтва мае ў сваім складзе шэраг груп аратых, сяўцоў, баранавальнікаў, падвозчыкаў, якія выконваюць усе віды работы на полі. Тое самае і ў жывёлагадоўлі, агародніцтве і інш галінах с.-гасп. вытворчасьці.

Брыгада разьбіваецца на шэраг груп. Так, напр., брыгада з 40 чал. па рабоце ў зборы падзяляецца на 4 групы: 1-я група даільніц (13 чал,), 2-я група па вырашчваньню маладняка (9 чал.), 3-я група па догляду за малочнай продукцыйнай жывёлай (11 чал.), 4-я па рабоце ў сьвінарні-ах (7 чал.)

Такім чынам адбываецца разьмеркаваньне працы і яе спэцыялізацыя ўнутры брыгады паміж паасобнымі групамі, а далей група разьмяркоўвае свае абавязкі паміж паасобнымі яе членамі.

Брыгады організоўваюцца на добраахвотных пачатках, але пры абавязковым рэгуляваньні іх складу праўленьнем. Склад брыгады можа быць сталым сэзонным і часовым, у залежнасьці ад умоў кожнай галіны гаспадаркі. Напр.: у жывёлагадоўлі, дзе работа адбываецца круглы год, будзе лепш ужываць сталыя брыгады, у лугаводзтве—сэзонныя, у іншых дробных работах—часовыя.

Да кожнай брыгады, пад яе адказнасьць, трэба прымацоўваць патрэбны ёй для выкананьня адзначаных работ жывы і мёртвы інвэнтар, матар'ялы і інструманты, што забясьпечыць іх лепшае захаваньне, створыць пачуцьцё колектыўнай грамадзкасьці. будзе рашуча біць па клясавым ворагу і яго ўплыве ў колектыўнай гаспадарцы.

Для кіраўніцтва брыгадай, праўленьне, пасьля абгаварэньня на агульным сходзе, назначае з лепшых колгасьнікаў старшыню брыгады (брыгадзіра), які нясе адказнасьць за работу брыгады перад праўленьнем.

У адпаведнасьці з разьмерам вытворчасьці, брыгады ўтвараюцца рознай велічыні з такім разьлікам, каб максымальна і найбольш рацыянальна скарыстаць працу кожнага колгасьніка.

ДЗЬМІТРЫЕЎ.

ДАКЛАД ПА-ЗА ПАВЕСТКАЙ ДНЯ

—МАЛАДЫЯ БУДАУНІКІ!
НА БАЯВЫЯ СПРАВЫ, ПРЫМАЙЦЕ НАРАД!

Стандартызацыя—важнейшы вучастак рацыяналізацыі будаўніцтва. Будаўнічы комсамол павінен аўладаць вышынямі тэхнікі, плянаваньнем і гэтым адсталым вучасткам

Гэтымі днямі адбудзецца агульна-гарадзкая конфэрэнцыя рабочай моладзі будаўнікоў, прысьвечаная ходу падрыхтоўкі да сэзону і барацьбе за аўладаньне тэхнікай.

Конфэрэнцыя павінна будзе вызначыць конкрэтныя шляхі для ўдзелу комсамолу ў выкананьні пляну будаўніцтва. Асноўнымі вузлавымі пытаньнямі павінна стаць аўладаньне тэхнікай, барацьба за якасьць і за тэмпы, барацьба за стандартызацыю будаўніцтва і мэханізацыю яго.

Комсамольскія колектывы павінны скарыстаць рэшту часу для лепшай падрыхтоўкі да конфэрэнцыі з тым, каб, паказаўшы свой вопыт, дамагчыся лепшых вынікаў у рашаючым сэзоне рашаючага трэцяга году пяцігодкі.

Баявая задача дня

Стандартызацыя ўяўляе сабой натуральную частку агульнай задачы рацыяналізацыі нашага будаўніцтва. Без стандартызацыі немагчыма масавая вытворчасьць. Стандартызацыя аблягчае ўвядзеньне вытворчасьці няспынным патокам, павышае якасьць продукцыі, адначасова зьніжаючы сабекошт вытворчасьці. Стандартызацыя вытворчасьці і асабліва будаўніцтва ва ўмовах нашай сацыялістычнай гаспадаркі набывае надзвычайна важнае значэньне.

Аднак, да апошняга часу, нягледзячы на значныя дасягненьні ў справе стандартызацыі, шырокай масавай прапаганды стандартаў і прымяненьня яго няма. Толькі вельмі вузкія колы спэцыялістых, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у распрацоўцы стандарту, знаёмы з гэтай справай.

Шырокія масы інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў прамысловых і будаўнічых рабочых аб стандартызацыі маюць самае няяснае ўяўленьне. Зразумела, што такое становішча нельга прызнаць нормальным.

Задача распрацоўкі новых стандартаў можа быць выканана толькі пры ўмовах, калі да яе будуць прыцягнуты мясцовыя прадстаўнікі, якія непасрэдна заняты на будаўніцтве.

Гэта-ж у большай сваей ступені адносіцца і да контролю за захаваньнем агульна-саюзных стандартаў. Контроль за правядзеньне стандартаў можа быць пасьпяховым толькі ў тым выпадку, калі кожны інжынэрна-тэхнічны працаўнік, кожны рабочы і служачы, комсамолец і малады рабочы будуць ведаць аб стандартах, якія дзейнічаюць у данай галіне вытворчасьці і ў сваёй штодзённай працы контраляваць іх захаваньне.

У гэтай галіне пры актыўным удзеле ўсіх працоўных можна дабіцца значнага паляпшэньня будаўніцтва і зьніжэньня сабекошту згодна з тымі контрольных лічбаў, якія былі вызначаны.

Барацьба за стандартызацыю будаўніцтва павінна стаць адной з асноўных пытаньняў барацьбы комсамолу за пасьпяховае выкананьне будаўнічых плянаў, за аўладаньне тэхнікай, за якасныя паказчыкі будаўніцтва.

Патрэбен будаўнічы завод

Ня толькі бясплянавасьць у скарыстаньні сродкаў будаўніцтва, растраноўцы рабочай сілы і выкарыстоўваньні будаўнічых матар'ялаў зьяўляецца прычынай недавыкананьня будаўнічай програмы за леташні будаўнічы сэзон па Менскаму аддзяленьню Белдзяржбудаб'яднаньню на 30 проц.

Аднэй з галоўных прычын перавыдаткоўваньня (упараўнаньні з контрольнымі лічбамі) на 1,5 мільёну руб. зьяўляецца бясплянавае плянаваньне, нежаданьне ўводзіць стандартызацыю нават самых звычайных масавых дэталяй будаўніцтва, як дзьверы, рамы, і г. д.

Некаторыя гаспадаркі абяцаюць, што ў цэнтральных майстэрнях Менаддзяленьня Мендзяржбудаб,яднаньня стандартызацыя ўводзіцца і з працягам часу будзе ўведзена. Але на практыцы мы бачым зусім адваротнае.

На вялікі жаль прыкладаў багата.

Фабрыка-кухня, якая будзе мець 130 вакон, будзе таксама вылучацца 24-мя рознастайнымі памерамі і фасонамі. Тое-ж самае было і з проэктам Дому Друку, у які прышлося ўносіць карэнныя зьмены.

Стандартызацыі рыштаваньняў няма, між тым, як з лесам на будаўніцтве надзвычайна напружанае становішча 4170 кубамэтраў лесу з-за недахопу транспарту не дастаўлены на пабудовы. Пры гэтых умовах, рыштаваньні, апалубка будуецца з новага лесу, які потым псуецца і губіць сваю каштоўнасьць. Тое-ж самае адносіцца і да бэтонных прац.

Кожны проэкт уяўляе сабою новы фасон. Пагоня за фасонам прыносіць надзвычайна вялікую дарэмную трату сродкаў, трату матар'ялаў і часу, што паграджаюча адбіваецца на выкананьні пляну будаўніцтва.

Калі мы можам яшчэ разважаць наконт стандартызацыі фабрычнага і заводзкага будаўніцтва, якое зьвязана з абсталяваньнем і ўмовамі вытворчасьці, дык наконт жыльлёвага будаўніцтва ніякіх разважаньняў ня можа быць, а ў гэты час проэктуючыя жыльлёвае будаўніцтва яшчэ не пакінулі гнацца за фасонам і формай.

У Белдзярбудзе, Белжылсаюзе рабочыя прапановы па пытаньню паляпшэньня будаўніцтва і прыватнасьці стандартызацыі яго (а яны бываюць досыць часта), не знаходзяць канкрэтнага праламленьня. Выпрабоўваюць тое, што даўно вызначана і праводзіцца на будаўніцтве іншымі будаўнічымі організацыямі Савецкага саюзу і за мяжой.

Як прыклад можна прывесьці выпрацоўку дэфэктыўна (порыста) цэглы, якая каштуе значна таней і зьяўляецца менш дэфэцытнай. Гэта цэгла не знайшла сабе прымяненьня на нашым будаўніцтве.

Выпрацоўка балак Губера пры укладцы не патрабуе рыштаваньняў і каштуе значна таней. Прымяненьне іх у Нямеччыне ў апошні час на будаўніцтве Савецкага Саюзу гэта даказала, але блізарукасьць і коснасьць асобных гаспадарнікаў, нежаданьне стандартызаваць будаўніцтва прыводзіць да таго, што ўсе гэтыя формы ігнаруюцца.

Стандартызацыя будаўніцтва патрабуе падзяленьня працы, якое (акрамя стандартызацыі) дае вялікую экономію. Калі рама без падзяленьня працы каштуе у сярэднім 190 рублёў; дык пры падзяленьні працы яны каштуюць усяго 60. Калі да гэтага дадаць што вялікая колькасьць рам аднэй конструкцыі даюць яшчэ большую экономію і зьніжаюць сабекошт. Гэта адзіночны прыклад.

Калі узяць усе будаўнічыя працы і стандартызаваць іх, прычым ва умовах будаўнічага заводу організаваць падзяленьне працы, атрымаецца надзвычайна вялікая экономія.

Для лепшага ілюстраваньня вышэй прыведзеных фактаў можна прывесьці прыклад з працы аднэй з буйнейшых будаўнічых кантор Савецкага Саюзу „Строитель" Пролетарскага раёну Масквы. Гэта кантора задалася мэтай правесьці ў жыцьцё замежны вопыт, які дае лепшыя вынікі па экономіі сродкаў і матар'ялаў, павышаючы вытворчасьць і якасьць продукцыі—пабудаваць будаўнічы завод. „Строитель" з гэтай задачай справіўся.

Быў пабудаваны драўляны будынак, часткова з таннага матар'ялу і кават адходаў, які каштаваў 75 тыс. рублёў. Галоўны корпус жалеза-бэтоннага цэху пабудаваны на 22 тыс. кубамэтраў. Завод мае жалеза-бэтонны, дрэваапрацоўчы і мэталюргічныя цэхі. Акрамя гэтага пабудаваны вопытна-дасьледчы цэх, які мае надзвычайна вялікае значэньне.

Зараз пры адназьменнай працы заводу, які каштаваў 75 тыс. руб. дае у год продукцыі на 5 мільёнаў, 575 тыс. рублёў. Асабліва важнае значэньне заводу заключаецца ў тым, што ён выконвае стандартную працу, маючы асобныя падзяленьні для загатоўкі заказаў на пабудовы.

На заводзе падзяленьне працы прымяняецца ў самым шырокім памеры. Гаспадарнікі Белдзяржбуду сьцьвярджаюць, што пляны дробных пабудоў не заўсёды могуць быць ужыты для буйных пабудоў з пэўнымі дапаўненьнямі і наадварот, але вопыт паказаў, што проэкт пабудовы агульнажыцьця ў Горках на 900 чалавек быў ўжыты для агульнажыцьця хэміка-тэхнолёгічным інстытутам у Менску на 300 чалавек.

Неабходна рашуча паставіць пытаньне аб будаўніцтве будаўнічага заводу для Беларусі. Гэты завод павінен будзе абслужыць будаўніцтва Беларусі. Стандартызацыя будаўніцтва павінна знайсьці сваё законнае месца ў сёлеташнім будаўнічым сэзоне. Комсамольская організацыя будаўніцтва павінна стаць у першыя шэрагі барацьбітоў за стандарт. Вопыт пролетарскага раёну Масквы „Строителя" павінен быць вывучаны і найхутчэй перакінуты у будаўніцтва Беларусі.

Конфэрэнцыя рабочай моладзі будаўнікоў павінна сказаць па гэтаму пытаньню сваё слова.

С. К.

Уключаемся ў паход

Менбудкантора БЖС сёлета павінна правесьці работу на 8 мільёнаў рублёў. Намечана пабудаваць рад жыльлёвых памяшканьняў, культурных і навучальных устаноў. Па жактах намечана правесьці рамонтныя работы на мільён рублёў.

Пры ўсіх гэтых вялізарнейшых задачах падрыхтоўка да сэзону праходзіць вельмі слаба, бо ня ўсе гаспадарчыя організацыі склалі дагавары, ня вызначылі каштарысы, не падрыхтавалі проекты і рабочыя чарцяжы.

Грамадзкія і партыйныя організацыі канторы яшчэ не перабудавалі сваю працу ў адпаведнасьці з задачамі падрыхтоўкі да сэзону. Амаль нічога ня зроблена для сустрэчы з сэзоньнікамі, слаба разгорнута праца па вучоту рацыяналізатарскіх магчымасьцяй і мэханізацыі будаўніцтва.

Па ініцыятыве комсамольскага колектыву організоўваюцца ўдарныя маладзёжныя брыгады, якія павінны будуць паказаць прыклад ударнай бальшавіцкай працы.

Гэтымі днямі комсамольскі колектыў склікае нараду рабочай моладзі сумесна з тэхнічнымі сіламі, на якой будуць распрацаваны конкрэтныя мерапрыемствы па аўладаньню тэхнікай ва ўмовах канторы.

Боня

Ац! два!

Нявінна асуджаны...

Контрасты



На здымку; будынак з двух паверхаў, у якім ёсьць пяць розных памераў аконных рам. У овале—амэрыканскі 40-павярховы небаскроб, не маюць толькі два памеры вокнаў.

Сустрэнем падрыхтаванымі

На абвесцы дня фактычна стаяла адно пытаньне: аб ўключэньне комсамольскага колектыву Менбудтрэсту ў паход за тэхніку і стан падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону. Ды ці магло быць інакш? Інакш не магло быць!

Менбудтрэст не падрыхтаваны да будаўнічага сэзону. Яшчэ да гэтага часу ня вызначаны проэкты і рабочыя чарцяжы, не складзены дагавары, яшчэ дагэтуль ня ўлічаны мэханізмы, якія ёсьць на будаўніцтве. па стандартызацыі будаўніцтва таксама яшчэ нічога ня зроблена.

Інакш не магло быць пастаўлена пытаньне. Так гаварылі 14 чалавек, выступаўшыя ў спрэчках Гаварылі аб многім. Не гаварылі наогул аб тэхніцы, гаварылі аб практыцы вытворчых будняў, гаварылі аб стане будаўніцтва —вось аб чым гаварылі.

Комсамольскі колектыў Менбудтрэсту да гэтага часу ня зьдзейсьніў павароту тварам да вытворчасьці. Яўныя прарывы на будаўніцтве ў мінулым не паслужылі повадам для мобілізацыі ўсіх комсамольцаў на барацьбу з прарывамі за выкананьне будаўнічых плянаў.

Комсамольскі колектыў не карыстаецца аўтарытэтам сярод рабочых будаўнікоў і адміністрацыі.

І зусім не выпадкова здарылася, што запрошаныя на сход прадстаўнікі адміністрацыі не зьявіліся, і зусім невыпадковымі зьяўляюцца факты, калі адміністрацыя нячула адносіцца да прапаноў комсамольцаў.

Якасьць будаўнічых работ надзвычайна дрэнная. Бывае, што закончаная работа праз некаторы час перарабляецца. Аб гэтым сьведчыць тынк, які абваліўся са сьцен пабудовы дзяржбібліотэкі. Аб гэтым сьведчыць рад іншых фактаў.

Зусім дрэнна выкарыстоўваюцца механізмы на пабудовах. Бэтонамешалкі стаяць бяз працы і ніхто не клапоціцца аб тым, каб іх скарыстаць. Аутомашына, купленая за вялікія грошы, ляжыць на цэнтральнай базе амаль у разабраным выглядзе.

Гаварылі шмат аб чым. Праз усе гэтыя спрэчкі праслізгалі практычныя прапановы, вырывалі я тумкі і матар'ялы, якія раней ляжалі мёртвым капіталам, не мобілізаваныя, не накіраваныя на барацьбу за выкананьне будаўнічых плянаў.

Калі комсамолец Кантар тлумачыў слабы ўдзел моладзі ў будаўніцтве, як вынік адсутнасьці вучоту ўдарніцтва і лічыў, што бухгальтэрыя павінна заняцца вучотам ударніцтва, таксама як і вучотам іншых паказчыкаў, дык і гэта думка таксама ня была падтрымана.

Сход выказаў сваю думку аб неабходнасьці ўстанавіць ня толькі вучот ударнасьці, але і організацыі ўдарніцкага руху, скарыстоўваньне вопыту комсамолу фабрык і заводаў, за вытворчыя манэўры на будаўніцтве і аўладаньне тэхнікай.

У барацьбе за стандартызацыю будаўніцтва, зьніжэньне сабекошту і павышэньне якасьці работы, за поўнае выкананьне будаўнічых плянаў, комсамольскі колектыў адваюе права на званьне ўдарнага атраду рабочай моладзі, бо комсамолец вызначаецца у тэмпах плюс якасьць.

Да агульна-гарадзкой конфэрэнцыі рабочае моладзі колектыў Менбуду прыйдзе са сваімі паказчыкамі і прапановамі з тым, каб, пачынаючы ад той конфэрэнцыі, разгарнуць сапраўдны бальшавіцкі штурм на фронце выкананьня кантрольных лічбаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Л. ГЛЕЗЭР.

„Выхад—у расійскім Кастрычніку“

Сем мільёнаў беспрацоўнай моладзі ў краінах капіталу

На наступленьне буржуазіі пролетарыят адказвае контрнаступленьнем

„Посьпехі комсамолу СССР—парука перамог сусьветнага комуністычнага юнацкага руху“

Артыкул члена Прэзыдыуму ВККІМ С. Фёдарава

Лютаўскі пашыраны прэзыдыум ВККІМ'у абгаварыў важнейшыя пытаньні работы Комінтэрну моладзі на даным этапе—аб ваеннай небясьпецы, фашызму і задачах КІМ'у, выніку IX зьезду УсеЛКСМ.

Буржуазія шалёна змагаецца за моладзь. Адсюль у шэрагу краін з дапамогаю хлусьлівых лёзунгаў фашызму ўдаецца ахапіць служачых і сялянскую моладзь, а мясцамі і значныя пласты маладых рабочых, пераважна батракоў.

Наступленьне фашыцкай буржуазіі і ўсіх яе прыслужнікаў натыкаецца на ўсё ўзрастаючае супраціўленьне мас моладзі. Усё больш юнацкіх забастовак, дэмонстрацый, усё часьцей беспарадкі, бунты ў арміі і флёце і выпадкі братаньня салдат з рабочымі і сялянамі. Узмацняецца разлажэньне ў радах варожых маладзёжных організацый.

Галоўная задача комсамолу зараз—заявіў прэзыдыум КІМ'у—узмацненьне організацый комсамолу на вытворчасьці; узмацненьне юнацкай профпозыцыі і організацыі і профсэкцыі і організацыі самаабароны; разгортваньне ў штодзённай практыцы настойлівага і шалёнага **контрнаступленьня супроць фашызму і вайны, за рэволюцыйны выхад з крызісу капіталізму, за савецкую ўладу.**

Барацьба з фашызмам і ваеннай небясьпекай патрабуе бязьлітаснай барацьбы з опортунізмам і справа, як галоўнай небясьпекай, і „зьлева“.

Прэзыдыум Комінтэрну моладзі праверыў выкананьне рашэньняў КІМ, у буйнейшым саюзам—комсамолам Нямеччыны.

У Нямеччыне, ахопленай вастрэйшым крызісам, нарастаюць зданi рэволюцыйнага крызісу. Перад нямецкай компартыяй і комсамолам стаіць важнейшая задача мобілізацыі ўсіх сіл працоўных мас пад гэгемоніяй пролетарыяту, каб ізрынуць насьпяваючую фашысцкую дыктатуру і устанавіць ў Нямеччыне ўладу саветаў.

Комсамол Нямеччыны, пад кіраўніцтвам компартыі і ВККІМ, „змог перамагчы „таптаньне на месцы“ і разгарнуць барацьбу на два фронты. Пачаўся паварот да сапраўднай масавай работы (саюз вырас на 75 проц.) З посьпехам ўжываецца соцыялістычнае спаборніцтва, разгортваецца самакрытыка. Дасягнуты посьпехі ў рабоце сярод праціўнікаў. Вырас політычны аўтарытэт комсамолу. Барацьба за масы рабочай моладзі прыняла наступальны характар. Але ня гледзячы на посьпехі оргработа яшчэ вельмі слабая. На заводах утворана ўсяго 250 ячэек. Нездавальняюча штодзённая экономічная работа, профсаюзная падрыхтоўка, кіраўніцтва забастоўкамі. Ня гледзячы на рад посьпехаў, недастатковая яшчэ барацьба супроць небясьпекі вайны і інтэрвэнцыі.

Цэнтральнай задачай пастаўлена перад нямецкім саюзам работа на заводзе.

Завод павінен стаць базай для экономічнага і політычнага наступленьня пролетарыяту, прымяненьня тактыкі адзінага фронту, утварэньня шырокага антыфашысцкага фронту. Гэта работа павінна стаць мерылам посьпехаў саюзу ў яго барацьбе за масы супроць фашызму, голаду, небясьпекі вайны і інтэрвэнцыі

Саюз павінен узмацніць барацьбу на два фронты, кіраўніцтва экономічнымі баямі і разлажэньне радоў праціўніка.

Посьпехі комсамолу Савецкага Саюзу—парука будучых перамог сусьветнага комуністычнага юнацкага руху.

ФАЛЬСЫФІКАЦЫЯЙ НЕ АДВЕРГНУЦЬ РЭЧАІСНАСЬЦІ

Колькасьць беспрацоўных ва ўсім сьвеце дасягае прыблізна 25-30 мільёнаў, у гэтым ліку—каля 7 мільёнаў рабочай моладзі. Усе сударгныя спробы капіталістычнага і соцыял-дэмократычнага друку скомбінаваць з наяўных даных больш нізкую лічбу, ні да якіх вынікаў не прывялі. Гэтая-ж самая шаноўная кампанія, соцыял-дэмократы і прадпрыемцы, імкнуліся паказаць гэты крызіс ў хлусьлівым асьвятленьні, стараліся давесьці, што мы маем справу з цяжкім, але ўсё-ж нормальным, уласьцівым капіталізму крызісам. З боку опортуністых у нашых радох соцыял-дэмократы і прадпрыемцы знайшлі падтрыманьне. Аднак, усе спробы фальсыфікацыі сапраўднасьці і абману не мяняе таго няўмольнага факту, што найшыршы і найглыбейшы крызіс усёй сыстэмы капіталістычнага грамадзкага парадку ўзрушае сьвет, паказваючы, што даўно ўжо прышоў час паконьчыць з гэтай балячкай і выкаваць новы соцыялістычны грамадзкі парадак.

Ці не зьяўляецца ліквідацыя беспрацоўя ў Савецкім Саюзе мацнейшым аргумэнтам супроць тых, як я думаюць, што ў сьвеце ў сучасны момант адбываецца звычайны кон'юнктурны крызіс—аргумэнтам і ў той-жа час указаньнем на той адзіны шлях, на якім можна прыйсьці да [illegible], прынцыповага вырашэньня ўсіх набалелых пытаньняў.

Калі мінулай зімою колькасьць беспрацоўных так шпарка расла, пацяшаліся надзеямі на вясну, калі прышла вясна—надзеямі на восень, якая павінна была прынесьці з сабой палепшаньне. Зараз колькасьць беспрацоўных яшчэ больш вырасла, але колькасьць тых, якія дазваляюць пацяшаць сябе надзеямі на вясну, значна скарацілася. Шырокія масы працоўных усё больш ясна разумеюць, што ім ня можа дапамагчы ніякая вясна, а толькі рускі Кастрычнік.

Мы ўсё яшчэ яскрава памятаем 6 сакавіка 1930 г., дзень, які актывізаваў шырокія масы беспрацоўных і занятых рабочых, у першую-ж чаргу—шырокія пласты беспрацоўнай моладзі. З таго часу крызіс моцна разросься і ў вір яго ўцягнуты краіны, якія раней ім менш былі закрануты, напрыклад, Францыя, якая ў мінулым годзе амаль ня ведала беспрацоўя. Патрэба пролетарыяту за гэты год [illegible] вырасла. Агульна вядома, што толькі ў нямногіх краінах беспрацоўныя атрымліваюць дзяржаўную дапамогу, ды і там, дзе дзяржава падае беспрацоўным некалькі грашэй—моладзь гэтай дапамогі не атрымлівае.

З проблемай беспрацоўя зьвязан цэлы рад пытаньняў, спэцыяльна закранаючых моладзь. У розных краінах яны, бязумоўна, розныя. Гэтыя пытаньні абгаварваліся на міжнароднай конфэрэнцыі моладзі, цяпер-ж іх трэба правесьці на практыцы. Мы не павінны адмаўляцца ад работы сярод тых пластоў, якія знаходзяцца пад рэформісцкім, хрысьціянскім, альбо фашысцкім уплывам. Яны павінны [illegible] у камітэты беспрацоўнай моладзі, гэтыя камітэты трэба значна пашырыць.



Экономічны крызіс у Нямеччыне працягвае паглыбляцца. Капіталістыя імкнуцца выйсьці з крызісу за лік рабочых.

На здымку: Натоўп рабочых ля заводу Шалькер Фэрэйн, дзе адміністрацыя абвясьціла аб звальненьні 500 рабочых.

СТАЧКА МОЛАДЗІ У ШВЭЦЫІ

У Гетэборгу на суднабудаўнічай вэрфі адбылася стачка моладзі, якая працягвалася 4 дні. Маладыя рабочыя патрабавалі, каб іх зарплата была павышана на 6 эрэ ў гадзіну. Дэлегацыя моладзі хацела ўступіць ў перагаворы з інжынэрамі, але гэта не ўдалося. Стачка пачалася а 12 гадзіне. А 1 гадзіне дарослых рабочых выгналі з прадпрыемства, бо яны не хацелі выконваць работу моладзі. Маленькая група рэнэгатаў і на гэты раз засталася на прадпрыемстве ў якасьці штрэйбрэхераў. Вечарам адбыўся стачачны сход. Рэформістыя мелі большасьць на гэтым сходзе і зьнялі з парадку дня пытаньне аб перевыбарах стачачнага кіраўніцтва. Тады моладзь накіравалася ў памяшканьне компартыі і выбрала там стачачнае кіраўніцтва ў складзе 6 чалавек. У суботу стачачнае кіраўніцтва хацела організаваць перамовы з прадпрыемцам, але яго не дапусьцілі да прадпрыемца. Кожны цэх мае сваю профсаюзную групу. Рэформісцкія групы організавалі перагаворы з прадпрыемцам і дабіліся павышэньня зарплаты ад 2 да 7 эрэ ў гадзіну. Пасьля гэтага праведзена было галасаваньне аб звароце на работу; 145 чалавек выказалася за зварот на работу і 88—супроць.

У аўторак работа была адноўлена. Моладзь, раней чым зьвярнуцца на работу, патрабавала прад'яўленьня сьпісаў, у якіх было-б указана павышэньне зарплаты. Адміністрацыя заявіла, што сьпісы будуць гатовы к 11 гадзіне. Яны пачалі працаваць, не азнаёміўшыся з гэтымі сьпісамі. А 1 гадзіне сьпісы былі гатовы і выявілася, што зарплата павышаецца не ад 2 да 7 эрэ, а ад 1 да 2-х эрэ. У выніку гэтага 56 маладых рабочых зноў забаставалі.

ІЛЬНУ ЧАКАЮЦЬ ВАРШТАТЫ

Работа па правядзеньню месячніка штурму разгорнута слаба

Скончыць ў тэрмін спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак

Гэтымі днямі на пасяджэньні чацьвёркі ЦК КП(б)Б і СНК БССР па пытаньню ільназагатовак былі заслуханы інформацыі **т. т. Абрамсона, Шэйніня, Вішнеўскага, Кандраля і Сталe.**

Нарада адзначыла, што яшчэ да гэтага часу пералому ў ходзе ільнапенькавагатотак няма, што раёны ня ўключыліся яшчэ ў месячнік загатовак, няма належнага націску на кулацкую частку вёскі ў сэнсе выкананьня дырэктыў ЦК і СНК аб давядзеньні цьвёрдага заданьня да кулацка-заможных гаспадарак (ахоплена 5,7 проц. двароў з удзелам у агульным выкананьні пляну па раёне на 12—15 проц., з боку часткі ўпаўнаважаных ЦК і СНК БССР заўважваецца дэмобілізацыйны настрой да ільназагатовак.

Чацьвёрка даручыла кожнаму раёну скончыць спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак у адпаведнасьці з дадзенымі дырэктывамі і абавязала РВК—узмацніць рэпрэсіі да кулацка-заможных гаспадарак, якія да гэтага часу яшчэ ня здалі лёну, а прокурору Рэспублікі прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у наслабленьні націску на кулакоў па выкананьню пляну ільнапенькавагатовак.

Белкоопсаюзу запрапанавана забясьпечыць прэміяваньне ў выкананьне пастановы чацьвёркі (прат.№23) аб выдачы тавараў ільнаводчай коопэрацыі для зборкі лёну па дварох.

У сувязі з тым, што наглядаюцца выпадкі звароту камандыраваных на ільназагатоўкі таварышоў з раёнаў ў Менск і з нізоўкі ў раён, што паслабляе тэмпы ільнапенькавагатовак, даручана ЦКК РСІ і РКК на мясцох працягваць да адказнасьці як пакінуўшых працу па ільназагатоўках таварышоў, так сама і тыя організацыі, якія дазволілі гэта бяз ведама ЦК і СНК, накіроўваючы зьвярнуўшыхся назад на працу па выкананьню ільназагатоўчых плянаў ня менш, як на 75 проц.

Абавязаць НКСнаб прыняць усе захады па забясьпечаньню таварамі, каб павялічыць прэміі тым здатчыкам, якія здалі лён да ўстаноўленай падвышанай нормы прэміраваньня. Чацьвёрка абавязала райвыканкомы прыняць захады да расьсьцілу ўсіх запасаў ільнасаломы, якая ёсьць ў савгасах, колгасах і ў аднаасобных гаспадарках з тым, каб не пазьней 1-га красавіка скончыць яго, выкарыстоўваючы для інструктажу ў гэтай галіне працы камандыраваных інструктароў.

Даручыць раённым організацыям аказаць дапамогу савгасам і колгасам, якія ня маюць выстарчальнай колькасьці рабочай сілы, шляхам організацыі брыгад.

Адзначаючы наяўнасьць фактаў эдачы Галоўленкому няпрыгоднай для заводаў ільнасаломы,—абавязаць райвыканкомы прыняць меры, каб на заводы накіроўвалася прыгодная ільнасалома, а няпрыгодная каб перапрацоўвалася, альбо расьсьцілалася на месцы.

Чацьвёрка пастанавіла правесьці праз друк пераклічку аб ходзе месячніку, які быў абвешчаны II Усебеларускім зьездам саветаў па ліквідацыі прарываў у загатоўках, асабліва лёну, па прыкладу пераклічкі, організаванай па пытаньню падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

ПРАРЫЎ ПАГЛЫБЛЯЕЦЦА

У большасьці сельсаветаў Чэрвеньскага раёну мясцовыя організацыі не зразумелі, што барацьба за лён ёсьць барацьба за нормальную, бесьперабойную работу нашай соцыялістычнай тэкстыльнай прамысловасьці, за поўнае выкананьне пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Работнікі загатоўчых організацый, замест пераключыцца на ўдарныя тэмпы штурму па ліквідацыі прарыву, усё яшчэ праяўляюць злачынную бязьдзейнасьць. Амаль па ўсіх сельсаветах колгасныя і бядняцка-серадняцкія масы ня былі мобілізаваны на правядзеньне месячніка загатовак. Рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі па неадкладнай здачы імі цьвёрдых заданьняў няма.

Не праведзена работа з колгасьнікамі, беднякамі і серадняками за выкананьне ільназагатовак у парадку самаабавязацельстваў.

А нарэшце прарыў паглыбляецца. Тэмпы ільназагатовак значна зьнізіліся. За апошнюю пяцідзёнку мы маем зьніжэньне на 1,5 проц.

Гадовы плян на сёньнешні дзень выкананы на 12 проц.

Абураюча злачынным зьяўляецца той факт, што ніводная з раённых організацый ня ведае становішча выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

Раённыя організацыі недастаткова займаюцца контроляваньнем мясцовых і ў першую чаргу загатоўчых організацый па выкананьню дырэктыў партыі і ўраду ў ільназагатоўках.

М. Ракіта.

Паведамленьне

Талочынскі РК КП(б)Б і РайКК-РСІ 16-га сакавіка, а 12 гадзіне дня ў памяшканьні Талочынскага Дому пролеткультуры склікае раённую нараду рабселькораў.

На нараду павінны зьявіцца: усе рабселькоры, юнкоры, члены рэдколегій насьценгазэт, сэкратары партыйных і комсамольскіх ячэек, члены групы „лёгкай кавалерыі“.

Яўка на нараду ўсіх сэкратароў партыйных і комсамольскіх ячэек абавязкова ў парадку партыйнай дысцыпліны.

РК КП(б)Б і РайКК-РСІ Талочынскага раёну

Адказны рэдактар— МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Гал·ўлітбел № 599